*Заўтра – сесія. Трывалыя веды – твой падарунак юбілею рэспублікі, студэнт!*




Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 20 (711) ● Пятніца, 31 мая 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI


## РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК КПСС—У ЖЫЦЦЁ!

**Звыш ста выпускнікоў хімічнага факультэта сабраліся на лекцыю дацэнта кафедры гісторыі КПСС Р. С. Маханька па матэрыялах красавіцкага Пленума ЦК КПСС. Рыгор Сцяпанавіч прааналізаваў Пастанову Пленума «Аб актуальных праблемах міжнароднага становішча і барацьбе КПСС за згуртаванасць сусветнага камуністычнага руху», падрабязна спыніўся на сучасных падзеях, а таксама на канкрэтных задачах савецкай моладзі ў выкананні рашэнняў партыі. Лекцыя была праслухана з вялікай увагай і выклікала шмат пытанняў, на якія Р. С. Маханёк даў вычарпальныя адказы.**

**Лекцыі і гутаркі аб Пленуме ЦК КПСС адбыліся на ўсіх курсах хімічнага факультэта. За апошні час студэнты праслухалі таксама рад дакладаў аб міжнародным становішчы, праблемах барацьбы двух ідэалогій і па іншых грамадска-палітычных тэмах. А. АРТАМОНАЎ.**

## ЗАКАНАМЕРНЫ ВЫНІК

На вясеннюю экзаменацыйную лінейку выйшла больш 1600 студэнтаў фізічнага факультэта. На ўсіх курсах у разгары заліковая пара.

— Рыхтаваліся да яе загадзя, — расказвае начальнік вучэбнай часткі факультэта Ягор Андрэевіч Піскуноў. — Расклад залікаў і экзаменаў распрацавалі з улікам пажаданняў студэнтаў, выбралі зручны час, вызначылі неабходны тэрмін для паспяховай падрыхтоўкі.

Цяпер выкладчыкі праводзяць кансультацыі, калоквіумы, аглядныя лекцыі.

Вялікая патрабавальнасць прад'яўляецца да дысцыпліны

Большасць студэнтаў працуе вельмі сумленна і напружана, выкарыстоўвае кожны дзень падрыхтоўкі з найбольшай нагрузкай. Заслугоўвае пахвалы тая ўпартасць і настойлівасць, з якімі вучацца замежныя студэнты. У гэтым годзе фізічны факультэт заканчваюць 13 замежных грамадзян — прадстаўнікі В'етнама і Кубы. Мы спадзяемся, што яны паспяхова здадуць экзамены, бо кожны з іх усе сілы аддае вучобе.

У той час, калі студэнты малодшых курсаў здаюць залікі і рыхтуюцца да экзаменаў, пяцікурснікі робяць апошнія, самыя адказныя крокі да дыплома. Нядаўна здадзен дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму. На жаль, для васьмі выпускнікоў ён закончыўся вельмі сумна — яны атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Восем правалаў на экзамене — гэта, вядома, ладзея не з прыемных. І мы папрасілі загадчыка кафедры навуковага камунізма М. Р. Круцько пракаменціраваць вынікі дзяржаўнага экзамена на фізічным факультэце.

— Няма нічога дзіўнага ў тым, што 8 з 259 экзаменаваных атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Іх магло быць і больш, калі б яшчэ частка студэнтаў своечасова не падцягнулася.

М. Р. Круцько характарызуе V курс фізфака цяперашняга выпуску як незвычайна неарганізаваны. На працягу года на пасяджэнні кафедры разоў пяць ішла гутарка аб нездавальняючым наведванні і падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў на гэтым курсе. Калі абмяркоўваўся тэрмін здачы экзамена, назначанага спачатку на красавік, прышлося прыняць рашэнне перанесці экзамен на май, паколькі курс не быў гатовы да здачы. Менавіта тут аказаліся студэнты, якія амаль упершыню сустрэліся з выкладчыкамі кафедры на дзяржаўным экзамене. А тут студэнцкая «анатомія» кожнага загаз была наяву: хто колькі прапусціў заняткаў, як адказваў на практычных. Таму зусім заканамерны вынік. Двойкі атрымалі тыя, хто не працаваў або вельмі дрэнна працаваў на працягу года. Разлікі некаторых «на тройку нагавару» не апраўдаліся. Восем выпускнікоў — Ю. Кароль, П. Мелюшын, А. Клеко, Л. Талніна, В. Рамановіч, А. Шкуратаў, Э. Цецярэўскі, М. Цвірко — накіруюцца на месца работы без дыпломаў, з надзеяй вытрымаць экзамен у будучым годзе. Агульны вынік дзяржэкзамена: 53 выдатных, 86 добрых, 112 здавальняючых і 8 нездавальняючых адзнак.

А. НІКОЛЕНКА.

**НА ЗДЫМКУ: перад дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй студэнтка пятага курса фізічнага факультэта Аня Шылава.**

Фота **І. Аскіркі.**

## ДАРАГІ КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Геолага-геаграфічны факультэт пачаў залікова-экзаменацыйную сесію першым. І гэта зразумела: вясна і лета тут — час палявых практык; дарагі кожны пагожы дзень, і таму «палявы сезон» пачынаецца ўжо ў канцы мая. Да яго пачатку студэнты павінны даць справаздачу аб сваёй рабоце, паказаць тыя веды, з якімі яны паедуць на шырокія прасторы роднай краіны.

Вучэбныя планы бягучага паўгоддзя выкананы на факультэце поўнасцю. Большасць студэнтаў вывучыла праграмную літаратуру, актыўна ўдзельнічала ў семінарах, акуратна выконвала практычныя работы. Гэтыя студэнты добрасумленна адносіліся да вучобы і на экзаменах адказваюць упэўнена, з глыбокім веданнем справы. У іх ліку можна назваць будучых геолагаў В. Шымановіча, В. Трэскіна; нядрэнна пачалі сесію і будучыя географы Л. Белавус, А. Лісаковіч, М. Вальчэк, І. Ванцлаў і іншыя. Але цяжка даводзіцца тым, хто ўсе надзеі ўскладаў на сесію. Вучэбны матэрыял цяжка засвоіць адразу; дні сталі даўжэй, але яны кароткія для тых, хто не накапіў патрэбных ведаў у годзе, не выканаў практычных і лабараторных работ. А, на жаль, такія студэнты ёсць. Не выканалі своечасова практычных работ па картаграфіі В. Пражнікава, А. Маркушэўскі, Н. Шастакова і іншыя. Некаторыя студэнты парушылі графікі прадстаўлення курсавых работ. У іх ліку можна назваць студэнтаў С. Залятаеву, Г. Коўзусь, П. Сныціну.

Студэнты, якія не ўпэўнены ў сваіх ведах, ужываюць на экзаменах шпаргалкі і падказы. Студэнцкая творчасць стварыла складаную сістэму выручкі непадрыхтаванага студэнта. Яе віды разнастайныя, але ў выніку ўсё прыводзіцца да розных падказаў. Была б гэтая творчасць накіравана на карысную справу, навука ўзбагацілася б многімі новымі адкрыццямі. Але, на жаль, не ўсе яшчэ разумеюць, што шпаргалкі прыносяць шкоду перш за ўсё самім навучэнцам. Сорамна студэнтам другога курса Р. Прахарэнка, Л. Падсабляевай, Г. Мікульскай, якія з'явіліся на экзамен па акіянаграфіі з цэлай сістэмай падказаў. Нельга не назваць і студэнтаў чацвёртага курса Т. Каргальцаву, І. Шадура, якія таксама карысталіся гэтай сістэмай.

Важнае месца ў падрыхтоўцы спецыяліста займаюць грамадскія навукі. Экзамены па гэтых дысцыплінах пачаліся на факультэце нядрэнна. Добрыя і выдатныя веды паказалі студэнты па асновах навуковага камунізма. Некалькі слабей веды па палітэканоміі, асабліва ў студэнтаў-вячэрнікаў. Наперадзе — экзамены па гісторыі КПСС, філасофіі, атэізму.

Большасць студэнтаў-географаў накіроўваецца пасля заканчэння вну на працу ў школу, таму педагагічная падрыхтоўка для іх асабліва важная. У гэтым годзе можна з задавальненнем адзначыць, што многія студэнты паказалі на экзамене па педагогіцы і методыцы добрыя і выдатныя веды.

На экзамены па спецыяльных дысцыплінах студэнты прыходзяць, як правіла, з неабходным веданнем тэорыі, але яшчэ не заўсёды ведаюць карту, часта адчуваюць цяжкасці ў практычным прымяненні тэорыі да канкрэтных умоў месца.

На зямлі ўжо няма невядомых краін, і сучасная геаграфія займаецца цяпер не адкрыццямі новых зямель, а глыбокім навуковым даследаваннем заселеных і засвоеных тэрыторый. Для гэтага сучасны географ павінен валодаць ведамі ў галіне матэматыкі, фізікі, хіміі. Гэтыя дысцыпліны былі ўведзены ў вучэбныя планы параўнаўча нядаўна. Аднак да гэтай пары студэнты-географы на экзаменах па гэтых прадметах часцей за ўсё церпяць няўдачы. Ужо ў бягучай сесіі многія студэнты атрымалі нездавальняючыя адзнакі па хіміі. Веды па фізіцы і матэматыцы таксама павінны быць лепшымі.

Вывучэнне замежнай мовы патрабуе рэгулярнай паўсядзённай працы. Але не ўсе студэнты гэта зразумелі своечасова. Таму цяпер на экзаменах і заліках па замежнай мове нярэдка бываюць дрэнныя адзнакі.

Будучыя геолагі ўжо закончылі залікова-экзаменацыйную сесію, а ў географаў яна ў разгары.

В. ЖУЧКЕВІЧ,
дацэнт, кандыдат геаграфічных навук, намеснік дэкана.



**З далёкай Танзаніі прыехаў у Мінск Чарльз Сон Пал. Зараз ён студэнт другога курса матэматычнага факультэта. Спачатку цяжка было вучыцца, цяпер Чарльз Сон Пал добра валодае рускай мовай і паспяхова здае экзамены і залікі.**

**НА ЗДЫМКУ: Чарльз Сон Пал рыхтуецца да наступнага экзамена.**

Фота **І. Аскіркі.**

## НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

◆ *На падрыхтоўчым факультэце адбылася сустрэча в'етнамскіх студэнтаў з былым начальнікам штаба Першай Мінскай партызанскай брыгады Міхаілам Міхайлавічам Джагаравым, які расказаў шмат цікавага аб жыцці і барацьбе народных мсціўцаў у гады суровых выпрабаванняў.*

◆ *Сёння вялікая група замежных студэнтаў, што навучаюцца ў нашым універсітэце і ў Беларускім палітэхнічным інстытуце, выехала ў госці да моладзі Дзяржынска. Юнакі і дзяўчаты розных краін свету абмяняюцца думкамі па надзённых праблемах сучаснасці, прымуць удзел у інтэрнацыянальным канцэрце мастацкай самадзейнасці.*

## НАПЯРЭДАДНІ ЗАКЛЮЧНАГА ТУРА

**У канцы красавіка ва універсітэце праходзіла XXV студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная ленінскім дням. На ёй было прачытана больш 330 дакладаў студэнтамі нашага універсітэта і гасцямі — прадстаўнікамі вну Ерэвана, Львова, Кіева, Гомеля. Цікава, з абмеркаваннямі дакладаў і дыскусіямі праходзіла работа секцый. На заключных пасяджэннях былі адзначаны лепшыя даклады і аўтарам уручаны граматы рэктара і памятныя падарункі. Узнагароджаны таксама пераможцы рэспубліканскага агляду студэнцкіх навуковых работ 1967-68 навучальнага года.**

**Адначасова з канферэнцыяй ва універсітэце праводзіўся першы тур усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых прац па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Ён ставіў сваёй мэтай выбраць удзельнікаў для другога тура (рэспубліканскага агляду). Ужо падведзены вынікі гэтага этапу. Адобрана звыш ста работ. Прыемна, што сярод аўтараў не толькі прадстаўнікі гуманітарных факультэтаў, але і прыродазнаўчых (фізфака, матфака, біяфака, хімфака, геолага-геаграфічнага).**

**Колькасць работ студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў, прайшоўшых на рэспубліканскі агляд па тэматыцы грамадскіх навук, рэзка ўзрасла ў параўнанні з мінулым годам.**

**У пачатку чэрвеня пачынаецца разгляд работ, прадстаўленых на другі тур конкурса. Лепшыя з іх будуць, як і ў мінулым годзе, адасланы ў Маскву для ўдзелу ў трэцім, заключным туры.**

**Б. ЗАМСКІ,**
**старшыня СНТ універсітэта.**

# ВЫЯВІЛІСЯ ЛЕПШЫЯ

У апошнія гады на кафедры англійскай мовы стала традыцыяй пры падвядзенні вынікаў работы наладжваць конкурсы на лепшы пераклад тэкстаў па спецыяльнасці.

У бягучым навучальным годзе быў праведзен конкурс на матэматычным, фізічным і хімічным факультэтах. З кожным годам лік студэнтаў, якія прымаюць удзел у конкурсе, павялічваецца, што сведчыць аб узрослай зацікаўленасці студэнтаў да вывучэння замежнай мовы. У конкурсе прымалі ўдзел студэнты другіх і трэціх курсаў. Ім быў прапанаваны для перакладу са слоўнікам неадаптаваны тэкст па спецыяльнасці. Некаторыя студэнты фізічнага факультэта перакладалі тэкст без слоўніка.

Праверка конкурсных работ паказала, што ўсе ўдзельнікі мерапрыемства справіліся з пастаўленай задачай, паказалі добрае ўменне і навыкі перакладу з англійскай мовы на рускую.

Лепшымі прызнаны работы М. Мяцельскага, А. Калініна, М. Ганкінай (III курс матфака), І. Арлова, В. Белабровіка (III курс фізфака), Касоўскай, Кісялёвай, Шагісултанавай (II курс фізфака), Е. Буслоўскай, В. Яськова, Л. Салаўёвай, В. Сахадзе, В. Цябенькавай (II курс хімфака), Л. Кірылавай, Г. Пятрова і Якавенка (II курс хімфака).

Пераможцам конкурсу ўручаны падарункі.

Т. КАВАНАВА,
загадчык кафедры англійскай мовы.



Хутка развітаюцца з універсітэтам выпускнікі. Апошнія дні студэнцкага жыцця запоўнены настойлівай працай.

НА ЗДЫМКУ: студэнтка пятага курса хімфака Людміла Захарава.

Фота І. АСКІРКІ.

# КАЛІ ТАБЕ КАМСАМОЛЕЦ ІМЯ

Набліжаецца 50-годдзе БССР, Кампартыі Беларусі і ВЛКСМ. Не выпадкова таму пытанні падрыхтоўкі да гэтых знамянальных дат сталі і ў цэнтры ўвагі камсамольскага сходу факультэта журналістыкі, які нядаўна адбыўся.

У дакладзе сакратара камітэта камсамола факультэта В. ПІШЧЫКА, які называўся «Камсамолец! Выдатная здача экзаменацыйнай сесіі — твой падарунак 50-годдзю БССР і ВЛКСМ», дастаткова поўна асвятляліся пытанні жыцця камсамольскай арганізацыі факультэта ўцэлым. Як вядома, факультэт журналістыкі самы малады ва універсітэце, ён існуе ўсяго адзін год, камсамольская арганізацыя — і таго менш. Але ўжо бачны тыя плённыя вынікі змяненняў, якія былі ўнесены ў жыццё студэнтаў-журналістаў. Павысілася паспяховасць студэнтаў. Умацавалася вучэбная дысцыпліна. Ажывілася спартыўная работа і работа СНТ.

Далей у дакладзе аналізавалася работа курсавых арганізацый факультэта. Было адзначана, што самай баявой і дзейснай арганізацыяй на факультэце з'яўляецца камсамольская арганізацыя другога курса (сакратар І. Асінскі). Тут сам сакратар, усе члены бюро, групкамсоргі і шматлікі актыў курса паказваюць прыклад у вучобе, дысцыпліне, у правядзенні камсамольскіх сходаў, маладзёжных вечароў, диспутаў і г. д. Студэнты другога курса паспяхова здалі зімовую экзаменацыйную сесію. Іх арганізацыя заваявала першае месца на факультэце і адно з першых ва універсітэце.

Гэта вынік прадуманай і мэтанакіраванай работы бюро курса. За няпоўны навучальны год на курсе было праведзена пяць сходаў, сем пасяджэнняў камсамольскага бюро, камсамольскі агеньчык, прысвечаны 49-й гадавіне ВЛКСМ і 50-годдзю Савецкай улады.

Аднак, як гэта адзначалася ў дакладзе, наколькі б ні былі значны поспехі арганізацыі другога курса, адна ластаўка вясны не прыносіць. У цэлым камсамольская арганізацыя факультэта яшчэ не мабілізавала ўсе свае сілы, каб выканаць паспяхова сваю галоўную задачу — аказваць дзейсную дапамогу партыйнай арганізацыі і дэканату ў наладжванні, правядзенні і ўдасканаленні навучальнага працэсу, у выхаванні высокакваліфікаваных і ідэйна загартаваных спецыялістаў. У выступленнях камсамольцаў і камуністаў факультэта адзначаліся недахопы ў правядзенні гэтай работы. Перш за ўсё выказвалася думка, што многія камсамольцы-журналісты перасталі быць зацікаўленымі ў сваёй спецыяльнасці, сістэматычна адсутнічаюць на занятках, пакідаюць лекцыі. Але куды яны ідуць? У бібліятэку? У музей? Далёка не так! Проста на вуліцу, снаваць па праспекту.

Камсамолец з другога курса, старшыня акадэмічнай камісіі В. ГУРЫН адзначаў, што ў час праверак такое ненаведванне часта заўважаецца як на першым і трэцім курсах, так і на другім курсе, які ў дакладзе быў залішне перахвалены. Асабліва часта ўцякаюць з заняткаў Пратасевіч (II курс), Лапацін (III курс), да таго ж яны з'яўляюцца «хвасцістамі». Паўстае пытанне: няўжо гэтыя людзі адпавядаюць высокаму званню студэнта-журналіста? Ці не пара камітэту ўмяшацца ў гэтую справу?

Старшыня прафбюро камсамолец М. ДРОЗД прыводзіў факты, якія гавораць аб невысокай дысцыпліне камсамольцаў у інтэрнаце. Асабліва скардзіўся камендант інтэрната на жыхароў 112, 113 і 72 пакояў, якія ноччу падымаюць крык, не даюць людзям спаць. Правільна адзначаў ён, што ў будучым, пры размеркаванні месц у інтэрнаце, трэба даваць іх толькі тым, хто ў іх мае патрэбу, за лік тых, хто дрэнна паводзіць сябе.

Дэкан факультэта Р. В. БУЛАЦКІ адзначыў, што камітэт факультэта слаба дапамагаў дэканату ў паляпшэнні вучэбнай дысцыпліны, не займаўся тымі камсамольцамі, якія часта прапускаюць лекцыі без уважлівых прычын, маюць сістэматычныя запазычанасці. Хіба паставіў камітэт камсамола перад дэканатам пытанне, каб зняць такіх студэнтаў са стыпендыі, каб выключыць з універсітэта? Не, гэтага не было. Калі яшчэ можна гаварыць аб некаторых поспехах у рабоце камсамольцаў другога курса, то на трэцім курсе (сакратар Т. Куляшова) — поўны разлад у гэтых адносінах. Гэта прызнае і В. Пішчык, калі гаворыць, што там дысцыпліна нікуды не вартая, на лекцыях часта — хоць шаром пакаці, у грамадскай рабоце ўдзел прымаюць толькі лічаныя адзінкі. Нават правесці апошні камсамольскі сход курсавому бюро было не пад сілу. Але камітэт камсамола факультэта і сам сакратар, які вучыцца на гэтым курсе, так і не змаглі навесці тут парадак.

Вялікую заклапочанасць і трывогу выклікае і дысцыпліна камсамольцаў. Факты паказваюць, што тут многа недахопаў. Заўважаюцца амаральныя паводзіны з боку камсамольцаў, факты несумленнасці, абману, выпівак і курэння ў інтэрнаце з боку дзяўчат. Такім камсамольцам, як Някрасава, Калантай, Мажэйка, Сокалава, Рыбакова і іншым, даўно ўжо пара задумацца аб сваіх паводзінах, таму што ганьбяць высокае званне і камсамольца, і будучага журналіста. Як бачна, фактаў такой дысцыпліны хоць адбаўляй. Аднак, як адзначаў у сваім выступленні і сакратар партбюро факультэта П. ПАБОКА, камітэт амаль не займаўся дысцыплінай камсамольцаў, праяўляў пасіўнасць і безініцыятыўнасць у гэтым пытанні. Замест таго, каб ставіць пытанні перад партбюро, камітэт камсамола толькі тады пачынае займацца дысцыплінай, калі гэта прапануе партбюро факультэта.

Горкім папрокам камсамольцам факультэта прагучала выступленне камуніста А. СЛУКІ, выпускніка, былога камандзіра цаліннага атрада факультэта. Той факт, заявіў ён, што з 183 камсамольцаў факультэта ў гэтым годзе едзе на цаліну толькі 13 чалавек і на будоўлі Беларусі ўсяго два камсамольцы, ганьбіць факультэт. У мінулыя гады журналісты былі заўсёды ў першых радах цаліннікаў. Дзе ж лепш можа пазнаць чалавек свет і адзін другога, калі не ў працы? Дзе яшчэ лепш можна набыць будучым журналістам уважлівасць, назіральнасць да жыцця, псіхалагічнае яго асэнсаванне? На жаль, як паказваюць лічбы, добрыя традыцыі факультэта загублены.

І як бы адказам на гэтае пытанне з'явілася выступленне дацэнта факультэта Е. Л. БОНДАРАВАЙ. Балюча бачыць і слухаць тое, што гаворыцца тут. Выступаюць усе «па чыну»: сакратар, намеснік, старшыня. А чаму маўчаць камсамольцы, самі студэнты? Няўжо няма ў іх аб чым сказаць, падзяліцца думкамі, запатрабаваннямі? Што ж перашкаджае ім? На мой погляд, гаворыць яна, гэта хвароба — абыякавасць. Раўнадушша да сваёй прафесіі, да свайго камсамольскага і грамадскага доўгу— вось што пачынае падточваць камсамольскую арганізацыю. Гэта тое галоўнае, што перашкаджае ўсёй нашай рабоце, што перашкаджае зразумець тую ісціну, што студэнт — гэта не проста залічаны ў інстытут, а чалавек-грамадзянін, з вялікімі запатрабаваннямі і абавязкамі, з вялікай і чулай душой, з унутраным гарэннем, з нецярпімасцю да раўнадушша. А яно—вораг нумар адзін!

Так, абыякавасць! Яна адчувалася ў зале, у адносінах камсамольцаў да таго, што гаварылася ў іх адрас, што прапаноўвалася сходу. Добрыя мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы 50-годдзя БССР і ВЛКСМ былі выпрацаваны камітэтам камсамола і маўкліва, без ніводнага дапаўнення і змянення прыняты сходам. Гэтая абыякавасць выявілася і ў тым, што камсамольцы не лічаць патрэбай ісці на свой факультэцкі сход: амаль палова камсамольцаў адсутнічала.

Ці здолее камсамольская арганізацыя факультэта журналістыкі пераадолець гэтую небяспечную хваробу, а камітэт камсамола перайсці ад сузіральнай і чакальнай палітыкі да баявой, наступаючай і дзейснай лініі па ўсіх напрамках камсамольскай работы, асабліва па адносінах да гультаёў і парушальнікаў дысцыпліны? Думаецца, што так будзе. Гэта — справа гонару маладога факультэта.

І. РЭКУЦ.



НА ЗДЫМКУ: студэнт першага курса геолага-геаграфічнага факультэта А. Шамякін (справа) здае залік па фізіцы выкладчыку Л. М. Быстрову.

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ—ФІЛАСОФІЯ

Авалоданне ведамі ў галіне грамадскіх навук з'яўляецца для студэнтаў не толькі тэарэтычнай, але і практычнай каштоўнасцю. Яны накіроўваюць маладога чалавека на актыўныя адносіны да жыцця, на свядомыя адносіны да вучобы, да грамадскай дзейнасці.

З задавальненнем можна адзначыць, што студэнты-матэматыкі настойліва авалодваюць марксісцка-ленінскай тэорыяй, маюць добрыя вынікі ў засваенні курсаў дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма. Практычная каштоўнасць набытых студэнтамі ведаў праяўляецца ў іх растучай зацікаўленасці да самастойных навуковых пошукаў у галіне філасофіі.

У мінулым навучальным годзе ў рэспубліканскім аглядзе-конкурсе навуковых студэнцкіх прац, прысвечаным 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, з дакладамі выступілі цяперашнія студэнты IV курса Міхаіл Кавалёў, кубінка Марыя Міранда, Кацярына Горбуз, выпускнік Аляксандр Пяткевіч, цяпер аспірант кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі.

У гэтым навучальным годзе кола студэнтаў-матэматыкаў, якія самастойна займаюцца вывучэннем і пасільным даследаваннем філасофскіх праблем, яшчэ больш пашырылася. На прайшоўшай у красавіку студэнцкай канферэнцыі з дакладамі па філасофскай праблематыцы выступілі 12 матэматыкаў другога і трэцяга курсаў. Другакурснікі Н. Раманоўская, А. Осіпава. Т. Ладышаў, А. Розет, Гарэлік настойліва займаліся вывучэннем і абагульненнем такіх пытанняў дыялектычнага матэрыялізма, як дыялектыка Гегеля — тэарэтычная крыніца марксісцкай філасофіі, невычарпальнасць матэрыі, праблема канечнага і бесканечнага ў філасофіі і матэматыцы сучасныя мадэлі Сусвету, класіфікацыя форм руху матэрыі і яе значэнне для класіфікацыі навук.

На секцыі гістарычнага матэрыялізма было заслухана 10 навуковых дакладаў студэнтаў, з іх сем — студэнтаў трэцяга курса матэматычнага факультэта.

Высокую ацэнку журы атрымалі даклады В. Гуліна («Выкарыстанне матэматычных метадаў у канкрэтных сацыялагічных даследаваннях»), О. Хострыцы («Міф аб «затуханні класавай барацьбы» і выступленні моладзі капіталістычных краін за свае сацыяльныя правы»), А. Ляонава («Да вызначэння прадмета метасацыялогіі»), Л. Ермаловіч («Становішча і духоўнае аблічча асобы ў сучасным капіталістычным грамадстве»), Л. Верынай («Сацыяльныя вынікі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі пры капіталізме»). Гэтыя работы рэкамендаваны на рэспубліканскі агляд. З цікавымі дакладамі выступілі таксама студэнты М. Дзеравенскі і О. Армонік.

Хочацца пажадаць студэнтам-матэматыкам далейшых поспехаў у вывучэнні марксісцка-ленінскай філасофіі, паглыблення іх зацікаўленасці да самастойных навуковых пошукаў у гэтай галіне.

Т. БАГДАНАВА,
кандыдат філасофскіх навук.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

# ПЫТАННЕ ЗАСТАЕЦЦА АДКРЫТЫМ

Рэйдавая камісія ў складзе прадстаўнікоў прафкома і супрацоўніка рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» выявіла рад недахопаў у адносінах студэнтаў да самаабслугоўвання, да захавання дзяржаўнай маёмасці, прытрымлівання распарадку дня ў інтэрнаце № 5.

Выніні рэйда абмяркоўваліся на пасяджэннях прафкома універсітэта і студсавета інтэрната. Для ліквідавання гэтых недахопаў прымаюцца найбольш эфектыўныя меры. Зроблены праверкі жыллёва-бытавой камісіяй студсавета і накладзены спагнанні на жыхароў, якія трымлівалі ў дрэнным санітарным стане пакоі, безадказна адносіліся да захавання грамадскай маёмасці. Пачалі больш патрабавальна адносіцца да тых, хто дзяжурыць ля ўвахода.

Праведзена нарада са старастамі паверхаў і пакояў, на якіх прысутнічалі прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько, сакратар парткома універсітэта Т. Я. Дударава і іншыя.

Адбыўся сход выкладчыкаў і студэнтаў фізічнага і матэматычнага факультэта, на якім прысутнічалі дэканы і сакратары камсамольскіх і партыйных бюро факультэтаў. На гэтых сходах многа ўвагі было ўдзелена пытанням маральнага аблічча студэнтаў, самаабслугоўванню і захаванню дзяржаўнай маёмасці.

Прымаюцца меры да таго, каб студэнты, якія паедуць на канікулы, здавалі свае пакоі ў поўным парадку каменданту інтэрната.

Але, нягледзячы на ўсе гэтыя захады, многія студэнты дрэнна адносяцца да захавання дзяржаўнай маёмасці, да санітарнага ўтрымання сваіх пакояў. 27 мая пры праверцы інтэрната прадстаўнікамі Мністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі было заўважана, што жыхары пакоя № 444 Аксак і Мураўёў ляжалі ў верхнім адзенні на ложках, на новых пакрывалах. Нават калі зайшла камісія, гэтыя студэнты «не здагадаліся» прывітацца, а засталіся ляжаць, як і ляжалі. Гэты ўчынак ні ў якім разе не можа дапасоўвацца да паводзін студэнтаў універсітэта. Сённяшняя наша задача—такія паводзіны выкараніць поўнасцю.

В. НЯСЦЮК,
старшыня студсавета інтэрната № 5.



# ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

Дошку гонару універсітэта ўпрыгожваюць імёны лепшых прадстаўнікоў факультэтаў, якія праявілі выдатныя здольнасці ў вучобе і грамадскай дзейнасці.

**На здымках:** (злева направа) У. Кузьмінаў (ІІ курс аддз. філасофіі), Б. Таўрагінскі (IV курс фізфака), Гра Рафаэль (ІІІ курс хімфака).
Фота Г. Марозава.



*У час фотапрактыкума другакурснікі фізічнага факультэта вывучылі тэорыю фотасправы, выканалі практычную работу — рабілі партрэтныя і жанравыя здымкі, самі праяўлялі і пячаталі іх.*
*НА ЗДЫМКУ: группа № 16 на практычных занятках.*
*Фота Г. МАРОЗАВА.*

# У ГОСЦІ З ПЕСНЯМІ

Майскай раніцай два «Ікарусы» накіраваліся ў горад Адэсу. У аўтобусах — народны аркестр народных інструментаў універсітэта, адзін з лепшых нашых самадзейных калектываў. У складзе аркестра салісты Анатоль Злобіч, Ларыса Чапурка, Жана Манастырная, Яўген Сафонаў, лаурэат Усесаюзнага фестывалю Святлана Дубоўская.

Добрае надвор'е, цудоўны святочны дзень стварылі радасны настрой. Стокіламетровая хуткасць бясшумных машын ператварыла паездку ў прыемнае падарожжа. Кіеў нас сустрэў урачыстай расквечанасцю Крэшчаціка, футбольнай сустрэчай паміж «Чарнаморцам» (Адэса) і «Дынама» (Кіеў). Дарэчы, нам вельмі цяжка было выбраць за каго балець: за Адэсу, куды мы ехалі на універсітэцкі фестываль, ці за Кіеў, дзе мы знаходзіліся.

А ў той час клуб Кіеўскага універсітэта падрыхтаваў нам пляцоўку для выступлення ў цэнтральным парку імя Т. Р. Шаўчэнкі. Гулам авацый сустрэлі кіяўляне выкананне народнай песні «Реве та стогне Дніпр широкій» і «Вячэрняй песні», якую выканала Жана Манастырская. Пасля канцэрта кіяўляне праводзілі нас удзячнымі ўсмешкамі, кветкамі і сяброўскімі поціскамі рук.

Наступнай раніцай мы ўжо былі каля мора, памыліся салёнай вадой, а некаторыя нават пакупаліся. Як даўніх знаёмых сустрэлі адэсіты, і не толькі нас, але і прадстаўнікоў іншых універсітэтаў: Варонежскага, Чарнігаўскага, Ужгарадскага, Вільнюскага, Ерэванскага, Бакінскага і іншых.

Першы дзень быў днём знаёмства з Адэсай. Трэба адзначыць, што пропускам нам усюды было «Мы з Мінска», хоць шасцігадовы адэсіт на пытанне «а дзе горад Мінск?» адказаў: «Гэта каля Кіева».

Другі дзень быў днём фестывалю універсітэтаў. Мы выступалі трэцімі. Трэба адзначыць, што наш калектыў выглядаў адным з лепшых. Гэта прызнала журы і відаць было па рэакцыі гледачоў. Яўгена Сафонава і Ларысу Чапурка некалькі разоў выклікалі на «біс». Многа разоў «бісіравалі» аркестру. У гэты ж дзень у нас была яшчэ адна цікавая сустрэча — з ваеннымі маракамі. Аркестр размясціўся проста на пірсе, які асвятлялі пражэктары караблёў. Ваенныя маракі цесным колам абступілі артыстаў. Стваралася ўражанне сяброўскай гутаркі моваў мастацтва, зразумелага людзям усіх узростаў і спецыяльнасцей. У знак удзячнасці камандаванне флота ўзнагародзіла калектыў граматай. А пасля яшчэ доўга працягваўся стыхійны канцэрт: танцавалі маракі, спявалі беларускія песні дзяўчаты з аркестра і разам кружыліся ў беларускай польцы, матроскім «Яблычку», украінскім «Крыжачку». Гэта сустрэча надоўга застанецца ў нашых сэрцах.

Апошні дзень нашага знаходжання ў Адэсе быў напружаным: давалі два канцэрты. Адзін з іх — заключны канцэрт ва універсітэце, дзе была амаль поўнасцю прадстаўлена наша праграма, а другі — пяты канцэрт па ліку, быў самым адказным: тысячы адэсітаў сабраліся ў цэнтральным парку горада, каб паслухаць наша выступленне.

Паездка надоўга застанецца ў памяці. Пяць канцэртаў на высокім узроўні даюць творчае задавальненне, згуртоўваюць калектыў. З Адэсы самадзейныя артысты прыехалі загарэлымі, з незабыўнымі ўражаннямі, пакінулі на поўдні шматлікіх сяброў.

Наперадзе новая творчая паездка ў горад Вільнюс на Ўсесаюзнае свята Песні, прысвечанае 50-годдзю ВЛКСМ.

**В. ЛІТВІНКА,**
**старшыня студэнцкага клуба.**



*Напружанасць экзаменацыйнай сесіі адчуваецца ўсюды: у лабараторыях, чытальных залах, вучэбных кабінетах, нават ва універсітэцкім парку.*
*НА ЗДЫМКАХ: здаецца, прыгажосць прыроды дапамагае гэтым дзяўчатам; перад залікам; рыхтуюцца да экзаменаў студэнты-завочнікі матэматычнага факультэта.*
*Фота І. АСКІРКІ.*

# СТАРАЕМСЯ ДАПАМАГЧЫ

Наступіла напружаная пара для нашых студэнтаў — вясенняя экзаменацыйная сесія. Кожную раніцу доўгая чарга стаіць каля дзвярэй чытальнай залы бібліятэкі, каб атрымаць патрэбную кнігу. Але гэта не заўсёды ўдаецца: не хапае рэдкіх экземпляраў кніг. У час сесіі павялічылася колькасць даўжнікоў, якія затрымліваюць кнігі. Гэтым яны пазбаўляюць сваіх таварышаў патрэбных кніг, не даюць ім магчымасці падрыхтавацца да заліка ці экзамена. Да безадказных студэнтаў можна аднесці С. Зімеліхіна, Т. Мініна (хімфак), І. Брускова (біяфак), А. Маркалёва (журфак), Н. Кімбар, Л. Федзежда (фізфак).

Нярэдка бывае так, што студэнты, якія чакаюць кнігу, парушаюць цішыню. Гэта таксама перашкаджае нармальнай рабоце чытальнай залы.

У час сесіі супрацоўнікі бібліятэкі робяць усё для таго, каб задаволіць патрэбы чытачоў. Былі дадаткова ўзяты неабходныя падручнікі, якіх не хапала ў бібліятэцы. Мы заўсёды гатовы падабраць патрэбную кнігу, аформіць на яе заказ, даць параду.

У другім семестры намнога павялічыліся заяўкі на кнігі, якія патрэбны для напісання курсавых і дыпломных работ. Вялікую дапамогу аказваюць студэнтам супрацоўнікі кнігасховішча А. Леус і В. Цельпухова. Яны своечасова падбіраюць літаратуру па заяўках, стараюцца адшукаць патрэбныя кнігі і як мага хутчэй даставіць іх студэнтам.

Для зручнасці студэнтаў чытальная зала цяпер працуе і па нядзелях.

У гэтыя адказныя дні летняй сесіі студэнты як ніколі павінны праяўляць высокую дысцыплінаванасць і арганізаванасць. Пасля здачы экзамена падручнік, па якім рыхтаваўся, часта бывае непатрэбным, яго неабходна тут жа, неадкладна вяртаць у бібліятэку, з тым, каб ён прыносіў карысць не толькі аднаму студэнту. Ад таго, наколькі студэнт будзе забяспечан неабходнай літаратурай, у значнай меры будзе залежаць і поспех на экзаменах.

Мы, супрацоўнікі бібліятэкі, ад усёй душы жадаем студэнтам здаць экзаменацыйна - заліковую сесію толькі на добра і выдатна.

**Н. МІЦКЕВІЧ,**
**ст. бібліятэкар.**



# КАБ ДУША І ЦЕЛА БЫЛІ МАЛАДЫМІ

*У маляўнічым месцы, на возеры Нарач размешчан спартыўна-аздараўленчы лагер, у якім вось ужо сем год у час канікул адпачываюць студэнты ўніверсітэта. У гэтым годзе з 9 ліпеня па 1 жніўня і з 1 па 24 жніўня ў лагеры пабывае каля 400 студэнтаў, якім будуць створаны ўсе ўмовы для актыўнага адпачынку, паляпшэння здароўя, фізічнай загартоўкі і павышэння іх спартыўнага майстэрства.*

*Асаблівая ўвага тут надаецца выхаваўчай рабоце, развіццю калектывізма, ініцыятывы і*

*Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў лагеры, цікавыя і разнастайныя. Акрамя 2-гадзінных заняткаў па выбранаму віду спорта, праводзяцца спаборніцтвы, таварыскія сустрэчы са студэнтамі іншых вну, што адпачываюць непадалёк ад нашага месцазнаходжання. Арганізоўваюцца пешыя і водныя турысцкія паходы па маляўнічых мясцінах нарачанскіх азёр, чытаюцца лекцыі, праводзяцца вечары самадзейнасці. У лагеры вядзецца навучанне плаванню пачынаючых. У клубе штодзённа дэманструюцца кінафільмы, працуе бібліятэка. Лагер радыёфікаваны.*

*Усе жадаючыя адпачыць на нарачанскіх плёсах падаюць заявы ў прафбюро сваіх факультэтаў да 4 чэрвеня.*

*М. ШЭЙНЕМАН,*

*ст. выкладчык, старшыня праўлення спортклуба.*





**На здымках: студэнты ў час летняга адпачынку.**

**Фота Д. Прэса.**

# ЯКІ ПРЫГОЖЫ ГЭТЫ СВЕТ!

— Ну вось і пяты паверх. Узляцеў, як на крылах. Далей я сам пайду.

Ён няўпэўнена становіцца на свае кволыя ногі і выцірае хусцінкай успацелы твар.

— Я зайду за табой, Сяргей. Чакай!

— Добра, — згаджаецца ён і павольна ідзе да чаргі, што выгнулася пытальнікам каля аўдыторыі.

Сёння ў яго апошні экзамен. Рашаючы.

— Ведаеш, — гаварыў ён мне ўчора, — я крыху набожны: веру ў прыкметы. Калі без перадышкі ўзбяруся на чацвёрты паверх, значыць і адпаведная будзе адзнака. Папярэдні экзамен, праўда, здаў на выдатна. Ну, дык гэта выпадковасць. Выключэнне з правіл. І смяецца.

Праз паўгадзіны.

— Віця! Ты змог бы спаць на цвіках?

— На коўдры ямчэй.

— А сур'ёзна?

— Наўрад.

— Вынослівы быў Рахметаў, — і палажыўшы кнігу на тонкія калены, глядзіць прама перад сабой.

«Што спахмурнеў, Сяргей? Якія думкі варушацца ў тваёй галаве». Але я маўчу. Ніяк не магу затрымаць сваёй увагі на чарговым пытанні. Падручнік раскрыты, я гляджу на чорныя радкі, а ўстрывожаная памяць выхоплівае то адзін, то другі малюнак.

...Пойдзем на прагулку, Віця. Колькі можна сядзець над кніжкамі. Не, лепш праз акно. Будзем эканоміць час. Вось я толькі перастаўлю нагу і мы на вуліцы.

Эх, і хуткасць у мяне.

Ён ледзьве перасоўваецца, і я бачу, якіх моцных намаганняў каштуе яму кожны крок.

— Тым не менш,—жартуе ён, — спаборніцтва з гусеніцай я выйграў бы. Ды што ты мяне падтрымліваеш. Пусці, я сам.

Адолеўшы выступ на тратуары. марыць.

— Вось залічаць нас з табой у студэнты. Такі банкет арганізуем. Не. Лепш пабяжым у рэстаран. Я ніколі ў ім яшчэ не быў. Будзем піць кактэйль. Праз трубачку...

..Спачатку нас было пяць. Потым стала чатыры. Сачыненне па рускай літаратуры вырвала з нашага пакоя яшчэ двух.

Мужныя хлопцы былі! Трымаліся да апошняга. Шкада іх. Асабліва Пецю,— засмучана гаворыць Сяргей. Цікава, якую ўсё ж даў ёй тэлеграму: тэрміновую ці звычайную?

(Я ўспомніў гэтага безклапотнага гітарыста і мяне разабраў смех. Ён напісаў на бланку «праваліўся» і гаворыць: «Калі пашлю тэрмінова—мама можа падумаць, што рад гэтаму. Але ж тут і другі бок — хутчэй вышле грошай на дарогу».

Ужо за поўнач.

— Ты не спіш? — пытаецца Сяргей.

— Сплю.

— Зразумела. Ты любіш вершы Астравога?

— Падабаюцца.

— А яго паэма «Мама»?

— Не чытаў.

Слабае святло вулічных ліхтароў высвечвае адкрыты, па-дзіцячаму, чысты твар Сяргея. Густыя бровы хмура сышліся на пераносіцы.

А я напамяць вывучыў, — і ён ціха, як малітву, прачытаў уступ. Затым яго голас мацнеў, нарастаў, то зноў спадаў да шэпту. І толькі адно слова паўтаралася без змены: ласкава, балюча, урачыста — «Мама».

...Пачакай крыху, я надзену свой святочны касцюм. Што за праява! Расту! Гальштук не буду павязваць. Мне брат такі вузел прыгожы зрабіў, што шкада лішві раз кранаць, а вось сапсуеш! Лепш увечары.

— Ну, пойдзем...

Спачатку пашукаем цябе ў спісах. Ёсць! Глядзі!.. 19! Ну, малайчына, Віця!

Ён хапае маю руку, трасе яе, і ў яго блакітных вачах столькі радасці, дабра...

Доўга мы стаім перад спісам гістарычнага факультэта.

Яшчэ і яшчэ раз праглядаем строгія і халодныя калонкі.

— Няма, — заключае Сяргей, і неяк прасторна павіс пінжак на яго плячах.

Банкет адкладваецца да наступнага года. Кажуць, цяпер дрэнны робяць кактэйль. Падвучацца за год. І я таксама.

Нешта гарачае сціскае мне горла. Цяжка паднімаюцца вейкі.

— Не сумуй, — кранае мяне за рукаў гімнасцёркі Сяргей. Гэта бывае. Конкурс.

— Ведаеш, я пайду спакоўваць чамадан, а ты вазьмі мне білет і дай тэлеграму брату. Вось адрас. Напішы: сустракай. І больш нічога. А то будзе хвалявацца.

Сяргей паехаў вячэрнім цягніком.

В. ПОЛЯК.



*ЗАЧЫТАУСЯ...*

*Фота С. Супруна.*

# *У свеце цікавага*

## РЭСПУБЛІКА ДОЎГАЖЫХАРОЎ

У Азербайджане больш аднаго працэнта насельніцтва складаюць людзі старэйшыя 80 год. На кожныя 10 тысяч жыхароў тут прыпадае 84 чалавекі, якія пераступілі векавы рубеж. На думку прафесара А. Караева гэта самы высокі паказчык у свеце. Вучонымі складзена своеасаблівая карта даўгалецця, якая дае уяўленне аб сувязі працягласці жыцця і рэльефа мясцовасці.

## КОЛЬКІ ГОД СОНЦУ?

Вынікі эксперыментаў па рэгістрацыі нейтрыно на глыбіні 1,6 кілометра ад паверхні зямлі ў Паўднёвай Дакоце (ЗША) абвяргаюць агульнапрынятую тэорыю адносна ўзросту і саставу Сонца. Было ўстаноўлена, што ўзрост Сонца, відавочна, менш 4,5 мільярда год, а тэмпература яго ўнутранага ядра складае больш 37 мільёнаў градусаў, а не 28,8 мільёна градусаў, як меркавалася.

## ПЛАЦІНА-ГІГАНТ

Пакістан мае намер пабудаваць адну з самых вялікіх ірыгацыйных насыпных плацін у свеце. Яе вышыня 148 метраў, даўжыня — 2,7 кілометра, яна перагародзіць інд у 170 кілометрах на паўночны захад ад горада Рэвалпіндзі. Апроч арашэння, гэта плаціна дасць запас вады, які дазволіць пабудаваць электрастанцыі магутнасцю 2,1 мільёна кілават.

## ХАЛОДНАЯ ВАДА СУПРАЦЬ АПЁКУ

Прафесар Граўндс (Аўстралія) даказаў, што халодная вада, пажадана з лёдам, — добры сродак лячэння апёкаў.

Рэзкае ахаладжэнне затрымлівае ўтварэнне апёкаў і змяненні капілярнай пранікнёнасці тканкаў, якімі звычайна суправаджаюцца апёкі, аказвае болесціхаючае ўздзеянне. Праўда, такі метад зручны толькі для лячэння лёгкіх апёкаў і павінен прымяняцца неадкладна пасля паражэння тканкі.

## ЭЛЕКТРОННЫ ЛОЦМАН

Алюміневы кабель таўшчынёй з карандаш можа весці рачное судна не горш капітана ці лоцмана. Ён пракладваецца пад вадой уздоўж фарватэра, і па ім прапускаюць пераменны ток. Узнікаючае электрамагнітнае поле рэгіструецца бартавымі антэнамі судна. Імпульсы перадаюцца на рулявое прыстасаванне, якое дзейнічае аўтаматычна.

Такая сістэма судаваджэння выпрабавана на Волжскім водасховішчы, недалёка ад горада Горкага. Максімальнае адхіленне цеплаходаў ад курса пры любым надвор'і не перавышала 6 метраў.

## ПАЛІМЕР, СУМЯШЧАЛЬНЫ З ЖЫВЫМ

Усё большае прымяненне ў медыцыне знаходзіць акрылавы палімер, распрацаваны прафесарам Отта Віхтэрле (Акадэмія навук у Празе, Чэхаславакія). Гэтая празрыстая пластмаса, цвёрдая ў сухім стане, у вадзе становіцца мяккай і гібкай. Яна пранікаемая для некаторых малекул і іонаў, а таксама для кіслarода і вуглекіслага газа. Пры імплатыраванні такая пластмаса не адхіляецца чалавечым арганізмам.

## БАКТЭРЫІ СУПРАЦЬ МЕТАНА

Бактэрый, паядаючых метан, прапанавалі прымяніць супроць гэтага небяспечнага газа ў вугальных шахтах савецкія спецыялісты.

Гэтыя бактэрыі былі адкрыты ў пачатку века, аднак спосаб выкарыстання іх у вугальных шахтах распрацаваны толькі цяпер у Горным інстытуце Масквы. У час эксперымента бактэрыі знішчылі васьміпрацэнтную канцэнтрацыю метана за некалькі сутак.

**(«Неделя» № 22 (430). 1968 год).**

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

Зак. 846. АТ 02231. **Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**